Авантурнасць у разгортванні сюжэта раманаў выразна выяўляецца і ў эпізодах, звязаных з каханнем герояў. У першых дзвюх кнігах у кожнага — і ў Вырвіча, і ў Лёдніка — мелася адна дама сэрца: адпаведна, Саламея Рэніч і Паланэя Багінская. Абставіны складваліся так, што доктар здраджваў уласнай жонцы. Аказваецца, што ў Лёдніка ёсць па-за шлюбам народжаны сын ад яго даўнішняй палюбоўніцы, муж якой быў першапачаткова гаспадаром Лёдніка. У душы ён па-ранейшаму кахаў Саламею. Што тычыцца Вырвіча, дык яго пачуцці ў адносінах да Паланэі Багінскай заставаліся без адказу. У трэцяй кнізе Л. Рублеўскай «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча» шляхціца кахае і сціплая прыгажуня Ганна Макавецкая (калісьці яна служыла камерысткай у Багінскіх, потым яе ўдачарыла шляхцянка, таму Ганна стала багатай нявестай), і эфектная прыгонная актрыса Раіна Міхалішыўна, якая належыць чорнаму магу, графу Батысту. Дзякуючы інтрыгуючым сюжэтным паваротам жаночыя вобразы атрымліваюць дадатковыя адценні, больш цікава раскрываюцца характары галоўных герояў, якія павінны рабіць выбар, у сюжэце з'яўляецца дадатковая інтрыга.

Першапачаткова ў друку анансавалася, што «Авантуры драгуна» [14] стануць апошняй часткай цыкла пра Вырвіча і Лёдніка, але Л. Рублеўская пакінула фінал рамана адкрытым. У 2015 г. выйшла чацвёртая частка тэтралогіі «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата», якая стала працягам «Авантур».

**Заключэнне**. Л. Рублеўская творча выкарыстоўвае традыцыі прыгодніцкага рамана. Яе творам уласціва таямнічасць, авантурнасць сюжэта, харызматычнасць і яркасць характараў герояў. Разам з тым жанр прыгодніцкага рамана Л. Рублеўскай мае развіццё. Жанравая мадыфікацыя праяўляецца ў шырокім выкарыстанні гістарычнага матэрыялу, элементаў фантасмагорыі.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Адамовіч А. Беларускі раман: станаўленне жанру. Мн., 1961. 180 с.
2. Благой Д. Исторический роман [Электронный ресурс] // Фундам. электрон. б-ка «Русская литература и фольклор». URL: http://feb-web.ru/feb/slt/abc/lt1/lt1-3351.htm (дата обращения: 01.09.2015).
3. Там же.
4. Наркевич А. Ю. Приключенческая литература // Краткая литературная энциклопедия / гл. ред. А. А. Сурков. М. : Совет. энцикл., 1968. Т. 5. 989 с.
5. З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / уклад. М. Мінзер. Мн. : Літ. і мастацтва, 2009. 464 с.
6. Грушэцкі А. Далёкія астравы, згубленыя скарбы // ЛіМ. 2014. № 45. С. 16.
7. Бельскі А. Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў. Мн. : Аверсэв, 2000. 127 с.
8. Рублеўская Л. І. Сэрца мармуровага анёла. Мн. : Маст. літ., 2003. 427 с.
9. Ожегов С. И., Шведова Н. Ю. Толковый словарь русского языка: 80 000 слов и фразеологических выражений. 4-е изд., доп. М. : Азбуковник, 1999. 944 с.
10. Рублеўская Л. І. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега: раман прыгодніцкі і фантасмагарычны. Мн. : Звязда, 2012. 272 с.
11. Там жа. С. 95.
12. Грушэцкі А. Далёкія астравы, згубленыя скарбы. С. 10.
13. Рублеўская Л. І. Авантуры студыёзуса Вырвіча: раман прыгодніцкі і фантасмагарычны. Мн. : Звязда, 2014. 320 с.
14. Рублеўская Л. І. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча: раман прыгодніцкі і фантасмагарычны. Мн. : Звязда, 2014. 320 с.


**УДК 882.6.09(091)(075.8)**

**І. С. Мялік**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## АДНОСІНЫ ДА РЭЧАЎ У КАНЦЭПЦЫІ ГЕРОЯ АПАВЯДАННЯ Л. КАЛЮГІ «НЕЗНАШОНЫЯ БОТЫ»

**Уводзіны.** Літаратура эстэтычна асвойвае свет у мастацкім слове. Яе вечнай тэмай і прадметам з'яўляюцца жыццё чалавека ў народзе і жыццё народа ў свеце, чалавек, прырода і грамадства ў іх узаемадзеянні. Мастацкі свет пачуццёва дакладны і матэрыяльна насычаны. Самыя, здавалася б, нязначныя, пабочныя дэталі, з'явы, учынкі, рысы характару герояў у ім служаць рэпрэзентацыі галоўнай ідэі твора, а таму выпадковымі не з'яўляюцца. «Рэчы мастацкага свету падпарадкаваны яго ўнутранай логіцы і задачы ўздзеяння на чалавека ў патрэбным эстэтычным напрамку» [1, с. 305]. Рэчы (прадметы і аб'екты рэчаіснасці) гэтак жа, як і прыродныя стыхіі, і характары, і абставіны, з'яўляюцца абагульненымі, канцэптуальна нагружанымі вобразамі, якія псіхалагічна, эстэтычна, па-філасофску ўздзейнічаюць на чалавека. Рэч некім зроблена, некаму належыць, выклікае да сябе пэўныя адносіны, робіцца крыніцай уражанняў, перажыванняў, роздуму. Як адзначае У. М. Тапароў, «у рэчы ёсць свая доля, у якой яна дыктуе сваю волю чалавеку. Не толькі чалавек — мера ўсіх рэчаў, але ў пэўнай ступені і наадварот: рэч — мера ўсіх людзей» [2, с. 70].

© Мялік І. С., 2016

**Асноўная частка.** Рэчавы свет у суаднесенасці з літаратурным героем, яго свядомасцю, ментальнымі працэсамі дапамагае глыбей выявіць эмацыянальна-духоўны ці экзістэнцыяльны стан асобы. Паэтыка рэчы знайшла мастацкае ўвасабленне ў творах Ядвігіна Ш., М. Гарэцкага, Я. Коласа, З. Бядулі, В. Ластоўскага, К. Чорнага, М. Зарэцкага, Л. Калюгі і іншых беларускіх пісьменнікаў. Можна прывесці шэраг разнастайных «рэчыўных» вобразаў: вырабы-рэчы ў «Бондары» З. Бядулі, «звон шыбаў» у аднайменным вершы Я. Коласа, «груда рэчаў» у аповесці «Дзве душы» М. Гарэцкага, транты, рызманы ў тэкстах К. Чорнага ці вобраз золата ў ягоных раманах, «незнашоныя боты» ў аднайменным апавяданні Л. Калюгі.

«Эстэтычнае сузіранне, — лічыў А. Бабарэка, — гэта тое, якое растлумачвае рэчы па аналогіі з чалавекам» [3, с. 374]. Літаратура XX ст. ўзбагаціла мастацка-выяўленчы дыяпазон вобразаў прадметна-рэчавага свету не толькі як матэрыяльных атрыбутаў чалавечага асяроддзя і існавання, але, перш за ўсё, як прадметаў, што арганічна зросліся з унутраным жыццём чалавека і з'яўляюцца носьбітамі самых разнастайных сімвалічных значэнняў. Такое паглыбленне мастацкай функцыі ўласціва рэчы, у прыватнасці, тады, калі яна пэўным чынам карэлюе з глыбінямі чалавечага быцця і свядомасці. Асоба, у тым ліку літаратурны герой, — гэта своеасаблівая сума ідэй, сукупнасць каштоўнасцей і ментальных якасцей. Даць характарыстыку таму ці іншаму народу як асобе азначае выявіць, што адрознівае яго ад іншых. Адным з параметраў канцэпцыі нацыянальнай асобы, паводле А. Ф. Лазурскага, выступаюць адносіны да рэчаў. Яны прадстаўлены ў наступным дыяпазоне: «любіць/цаніць; беражлівасць/абыякавасць; эстэтычныя/актыўныя адносіны; вытанчанасць/вядомасць; арыгінальнасць/пераймальнасць; празмернасць (багацце)/неабходнасць; простасць/добры густ» [4, с. 233]. Як адзначаў італьянскі мысляр Н. Абаньяна, «для чалавека важныя не толькі вялікія рэчы, але таксама і, перш за ўсё, нязначныя, што больш цесна акружаюць яго» [5, с. 11].

Экзістэнцыяльны сэнс адзінкавых рэчаў, што падзяляюць лёс свайго ўладальніка, заўсёды даследаваўся ў мастацтве слова. Галоўны герой апавядання Л. Калюгі «Незнашоныя боты» Андрук — тыповы герой-селянін. Менавіта ён з'яўляецца ўладальнікам гэтай незвычайнай рэчы. Андрук любіць быць у дарозе, сустракацца і гутарыць з людзьмі. Таму ён ахвотна наведвае кірмаш у мястэчку Хлюпск, дзе адчувае сябе вельмі камфортна. Да ўсяго іншага тут можна прыдбаць і якую капейку на гаспадарчыя патрэбы, прадаўшы сёе-тое з прадуктаў. «Не было тае нядзелі, каб без яго ў Хлюпску абышліся. Такая адлегласць... Андруку нічога не вадзіла — пераходкі не шкадаваў» [6, с. 71]. Ён быў чалавек не багаты, але і не бедны, паводле выразу Л. Калюгі, «у сярэднім пер'і». Але ва ўсякім разе аднавяскоўцы Андруку зайздросцілі. А як жа: і куры ў яго добра нясліся, і боты былі незнашоныя... Сяляне былі схільны бачыць у гэтым шанцаванні нават удзел нячыстай сілы. «Андрук — хто яго ведае, які чалавек. "Незнашоныя" яго боты гэтаксама, не можа быць, каб без якога вядзьмацтва такія моцныя ўдаліся» [7]. Боты і кажух увогуле заўсёды з'яўляліся прыналежнасцю заможнага селяніна. Боты вылучалі Андрука сярод аднавяскоўцаў, стваралі ўяўленне пра яго дабрабыт. «Бывала ў Хлюпску ўсе ў лапцях хадзілі — адзін Андрук у ботах. Вунь якая яму павага была за гэта! З самымі разумнікамі мог ён даступіцца пагаварыць» [8]. У прозе першай трэці XX ст. кажух і боты — яркія мастацкія дэталі, якія валодаюць сімвалічным значэннем. У апавяданні Л. Калюгі боты ў першую чаргу выступаюць паказчыкам ашчаднасці, беражлівасці героя, аб чым малады празаік гаворыць з уласцівай яму лёгкай іроніяй: «Дармо што ва ўсякі хлюпскі кірмаш быў Андрук у іх абуты, ніяк ён не мог тых ботаў знасіць, у руках носячы. У людзей, калі ботаў на год хапіла, дык і добра, а Андрук як пашыў сабе к вяселлю, дык і ў дамавіну яго паложаць, у тыя боты абуўшы» [9]. Для селяніна наяўнасць абутку вызначала многае. Нават сваім дабрабытам Андрук у пэўнай меры абавязаны ботам, якія надавалі яму прэзентабельны выгляд. Таму яму ўдавалася хутка прадаць на кірмашы ўвесь свой тавар: «...смела яйца, сыры куплялі ад яго, бо бачылі, што чысты, пашанотны чалавек» [10]. Як піша Л. Калюга, «шанавалі Андрука боты, шанаваў жа і ён іх, як вока ў ілбе: усё пад ногі сабе глядзеў, каб дзе ў лужыну не ўступіць, каб абысці…» [11]. Клопат пра боты як умову асабовага прэстыжу вымагаў ад героя канкрэтных учынкаў. «Андруку боты былі толькі дзеля людзей, а ў дарозе, ідучы, яны толькі ціснулі, мулялі і было цяжка нагам. Ён рабіў па-бабску: у канцы мястэчка, на беразе канавы, пад вілаватаю бярозаю садзіўся разувацца, як дадому ішоў» [12]. Аднак выказваць на людзях падобны клопат было не прынята. І на гэты конт у Андрука былі свае маўленчыя стратэгіі. За шчасце, паведамляе пісьменнік, было для яго прайсціся босымі нагамі ці ў лапцях. І тады ўжо «волен сабе, лёгак чалавек» [13]. Можна нават сказаць, што боты для Андрука з'яўляюцца не так прадметам неабходнасці і ўжытку, як аб'ектам сузірання і пэўных разваг. Л. Калюга, выдатны знаўца жыцця беларускай вёскі, надзвычай дакладна перадае іх напрамак: «Дармо што боты вады не пушчаюць, а шкадаваў іх Андрук у гразь саджаць — лапцям у яго было неблазе. А зімою, дык якая там чорт рызыка ў ботах, калі набярэцца на іх па возу снегу, што аж нагі не пацягнеш — тады толькі настывае тавар ды горай у нагу холадна. Ні разу Андрук не аграшыўся, зімою ботаў не надзеў» [14, с. 73]. Можна сказаць, што ў творы Л. Калюгі прадстаўлены нацыянальна адметныя падыходы да творчага вырашэння «задач зберажэння і асэнсавання адзінкавых рэчаў» [15].

На прыкладзе прааналізаванага апавядання мы бачым, як беларускі селянін Андрук ставіцца да матэрыяльных рэчаў. Свае боты ён любіць і цэніць, ставіцца да іх ашчадна, выяўляе свядомыя актыўныя адносіны да іх зберажэння. У выніку рэч самай блізкай неабходнасці паўстае ў вачах аднавяскоўцаў Андрука як атрыбут багацця яе ўладальніка. Нездарма беларусы склалі прымаўку «Відаць пана па халявах». Увогуле з матэрыяльнага, рэчыўнага неабходна вылучаць самае важнае, істотнае, што

характарызуе тып ці сутнасць адносін чалавека да жыцця і свету. Апавяданне Л. Калюгі дае чытачу ўяўленне пра небагатыя рэчы невядомых вялікаму свету людзей, але ад гэтага не змяншаецца каштоўнасць іх асэнсавання. З аднаго боку, «незнашоныя боты» з’яўляюцца паказчыкам побытавай уладкаванасці і дабрабыту героя, з другога ж — выступаюць адным са сродкаў выяўлення найлепшых якасцей беларусаў.

**Заключэнне.** Мастацкі свет літаратурнага твора прасякнуты пачуццямі і насычаны матэрыяльнымі аб’ектамі. Рэч ці рэчавая дэталь у тэкставай прасторы беларускай прозы першай трэці XX ст. адыгрывае важную ідэйна-мастацкую ролю, выконвае самыя розныя функцыі: сюжэтаўтваральную, сацыяльна-характарыстычную, канцэптуальную, эстэтычную, псіхалагічную, сімвалічную і інш. Рэч у мастацкім творы — неад’емная частка яго сэнсавай і вобразнай сістэмы, аўтарскай канцэпцыі чалавека, часу, рэчаіснасці. Адной з надзвычай рэпрэзентатыўных адзінак матыўна-вобразнага поля беларускай прозы з’яўляецца такая рэч бліжэйшага чалавечага акружэння, як боты. Яна не павінна разглядацца толькі ў рамках вузка-лакальнага падыходу, напрыклад, этнаграфічнага, бо здольна паўставаць абагульненым, канцэптуальна нагружаным вобразам, што мае месца і ў разгледжаным намі апавяданні Л. Калюгі. Пра гэта сведчыць загаловак апавядання, асаблівасці пабудовы сюжэта, характар аўтарскай прысутнасці ў тэксце і адметнасць аўтарскага маўлення. Апавяданне, прааналізаванае ў адзінстве зместу і формы, дае яскравае ўяўленне пра канцэптуальную адметнасць стаўлення беларусаў да рэчавага свету.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Борев Ю. Эстетика : в 2 т. Смоленск : Русич, 1997. Т. 1. 576 с.
2. Топоров В. Н. Вещь в антропоцентрической перспективе. М., 1993. С. 325.
3. Бабарэка А. Збор твораў у двух тамах. Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2011. Т. 2 : Проза, паэзія, філіязофія, публіцыстыка, запісныя кніжкі, дзённікі, лісты. 726 с.
4. Воробъёв В. В. Лингвокультурология : моногр. М. : РУДН, 2008. 336 с.
5. Всемирная философия. XX век / авт.-сост. А. П. Андриевский. Минск : Харвест, 2004. 832 с.
6. Калюга Л. Ні госць, ні гаспадар : апавяданні і аповесці. Мн : Маст. літ., 1974. 290 с.
7. Там жа. С. 72.
8. Там жа.
9. Там жа.
10. Там жа. С. 73.
11. Там жа. С. 72.
12. Там жа. С. 73.
13. Там жа.
14. Там жа.
15. Эпштейн М. Реалогия [Электронный ресурс]. URL: http://ec-dejavu.ru/r/Realogy.html (дата обращения: 03.09.2015).


**УДК 81’373**

**М. Ю. Пегусова**
*Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего профессионального образования «Воронежский государственный университет», Воронеж, Российская Федерация*

## ПРОБЛЕМА ИНТЕРПРЕТАЦИИ СЛОВ И ЗНАЧЕНИЙ В ПОЭЗИИ Д. В. ВЕНЕВИТИНОВА

**Введение.** В современных условиях перед педагогическим сообществом филологов стоят серьёзные и ответственные задачи, решение которых будет определять общий культурный уровень человека будущего. В философию и стратегию российского филологического образования всегда входили следующие нормы: соответствие современным требованиям общества и формирование направлений будущего, обеспечение уровня языковой подготовки, предполагающей академическую фундаментальность, универсализм, ориентацию на гуманитаризацию и гуманизацию знания, творческую направленность и духовное развитие человека.

Проблема отбора материала для изучения на уроках литературы (произведений, на которых должен обучаться и воспитываться ученик) — это одна из самых важных, насущных проблем современного филологического образования. Возвращение к классической традиции, изучение классической поэзии особенно важно сегодня в связи с тем, что перед современным обществом стоит задача расширения культурного пространства, сохранения базовых культурных знаний в области философии, науки, искусства. В произведениях авторов, корнями связанных с воронежской землёй, классических по форме и содержанию, есть всё, что позволяет решить указанные выше проблемы. Воронеж богат именами когда-то широко известных, а ныне незаслуженно забытых поэтов и писателей, одним из которых является Д. В. Веневитинов.

© Пегусова М. Ю., 2016